# Аднаўленне, захаванне і развіцце этнакультурнай спадчыны ў дзейнасці аб'яднанняў па інтарэсах мастацкага профілю дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі

*Малькевіч Аксана Вацлаваўна, метадыст першай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Пастаўскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі”*

***Анатацыя.*** У артыкуле раскрываецца вопыт работы Пастаўскага раённага цэнтра дзяцей і моладзі па перайманні, захаванні і трансляцыі этнакультурнай спадчыны беларускага народа праз этнакультурны вучэбны матэрыял у адпаведнасці са зместам праграм аб'яднанняў па інтарэсах. Прадстаўлена і апісана мадэль працы над скразной этнакультурнай тэмай, прыведзены прыклады магчымых накірункаў яе вывучэння, прагназуемыя вынікі, прапанаваны змест дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах мастацкага профілю дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Даецца апісанне вывучэння скразных тэм ”Чароўныя саламоны Пастаўшчыны“, ”Казачныя персанажы і вобразы беларускай міфалогіі, якія ўвасабляюць поры года“, ”Як святкуюць Каляды“, ”Сімвалы народнай харэаграфіі“. Па кожнай з вывучаемых тэм у Цэнтры дзяцей і моладзі праведзены выніковыя мерапрыемствы, якія ў артыкуле пададзены праз QR-коды.

Этнічная культура – скарб, які застаўся нам ад продкаў. Этнакультурная спадчына змяшчае два асноўныя кампаненты – матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці. Матэрыяльныя каштоўнасці – гэта мова, звычаі і традыцыі, народныя промыслы, танцавальная і музычная культура, вусная народная творчасць, помнікі гісторыі, архітэктуры, гульнёвы фальклор. Духоўныя каштоўнасці грунтуюцца на такіх паняццях, як гістарычная памяць, гістарычная спадчына, павага да продкаў, духоўныя ідэалы, любоў і павага да Радзімы, да роднай прыроды. Традыцыйная матэрыяльная і духоўная культура беларусаў – набытак многіх пакаленняў, якія сведчыць аб самабытнасці і непаўторнасці нашага народа.

У Пастаўскім раённым цэнтры дзяцей і моладзі пасляхова вядзецца работа па выкарыстанні і ўкараненні этнакультурнага матэрыялу ў адукацыйны працэс. Дзейнасць па вывучэнні і засваенні этнакультурнай спадчыны накіравана на засваенне каштоўнасцей і традыцый беларускай культуры ў сістэме дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, на выхаванне і станаўленне грамадзянскай свядомасці навучэнцаў на аснове культурных традыцый беларускага народа.

Этнакультурны матэрыял характарызуецца багаццем і шматвобраззем нацыянальнай, народнай культуры, адлюстроўвае этнічныя асаблівасці Пастаўшчыны, жыццевы уклад, звычаі, традыцыі, сацыяльныя нормы паводзін, маральныя каштоўнасці беларускага народа.

Этнакультурны кампанент у дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах падаецца праз:

– этнакультурны вучэбны матэрыял у адпаведнасці са зместам адукацыйных праграм;
– скразныя тэмы этнічнай культуры, якія вывучаюцца адначасова ў розных аб’яднаннях па інтарэсах мастацкага профілю;
– этнакультурную інфармацыю, як дадатак да асноўнага зместу заняткаў па інтарэсах.

Найбольшую цікавасць прадстаўляюць скразныя этнакультурныя тэмы, прысвечаныя вывучэнню пэўнай з’явы, факта, асобы, матэрыяльнай або духоўнай каштоўнасці. Асноўнае прызначэнне работы па скразной тэме - засваенне, захаванне і развіцце этнакультурнай спадчыны ў адукацыйнай і творчай дейнасці навучэнцаў аб’яднанняў па інтарэсах.

Тэма можа быць ёмістай: вывучэнне традыцый святкавання народных свят і абрадаў, напрыклад, ”На Купала ночка мала“; вывучэнне традыцыйнага беларускага арнаменту і творчага ўвасаблення беларускіх матываў ў традыцыйнай і сучаснай вышыўцы, напрыклад, ”Беларускія ўзоры“ і г.д. Або мець вузкую накіраванасць: напрыклад, прымеркаваная да дня нараджэння Уладзіміра Дубоўкі ”О, Беларусь, мая шыпшына…“ і інш.

Абмеркаванне і выбар скразных тэм адбываецца напярэдадні пачатку новага навучальнага года пры распрацоўцы праграм аб’яднанняў па інтарэсах і плана выхаваўчай работы Цэнтра.

**Этапы работы над скразной тэмай**

| | |
|---|---|
| **Падрыхтоўчы этап** | ❖ вызначэнне мэты і канкрэтных задач;<br>❖ вызначэнне тэрмінаў працы над тэмай;<br>❖ прагназуемыя вынікі рэалізацыі тэмы |
| **Асноўны этап** | ❖ вывучэнне тэмы ў аб’яднаннях па інтарэсах мастацкага профілю;<br>❖ метадычная падтрымка педагогаў |
| **Заключны этап** | ❖ правядзенне выніковага мерапрыемства;<br>❖ вызначэнне рэзультатыўнасці;<br>❖ падвядзенне вынікаў работы над тэмай |

***На падрыхтоўчым этапе вызначаюцца накірункі работы па абранай тэме:***
– азнаямленне з гісторыяй і традыцыямі беларускага народа, свайго рэгіена;
– вывучэнне абрадаў і народных гульняў, іх рэканструкцыя з улікам рэгіянальных асаблівасцей;
– засваенне традыцыйных промыслаў і рамёстваў, іх аднаўленне ў дзіцячай творчасці;
– аналіз і выяўленне агульнага, выключнага і асаблівага ў культуры, традыцыях і гісторыі народаў, якія пражываюць на суседніх тэрыторыях;
– дэманстрацыя і трансляцыя работ адукацыйнай і творчай дзейнасці навучэнцаў.

***Прагназуемыя вынікі:***

кагнітыўнае засваенне навучэнцамі элементаў этнічнай культуры, ўстойлівыя ўяўленні аб эстэтычнай каштоўнасці этнасу;

развіцце пачуцця грамадскай і нацыянальнай свядомасці, павагі да гісторыі і культуры свайго народа, каштоўнасных адносін да гісторыі, традыцый і культуры роднага краю

набыццё этнакультурных кампетэнцый, практычных уменняў і навыкаў у працэсе творчага ўвасаблення тэмы;

ідэнтыфікацыя з сапраўдным і канструктыўная дзейнасць па яго ўдасканальванню.

***Асноўны этап*** работы над скразой тэмай працягваецца ад двух тыдняў да трох месяцаў у залежнасці ад тэмы і мэты вывучэння. Ён самы ёмісты і складаны. Кожнае аб’яднанне па інтарэсах мастацкага профілю працуе над тэмай згодна пастаўленай задачы. Вядзецце пошук і азнаямленне з тэарэтычным матэрыялам па тэме, арганізуюцца экскурсіі, сустэчы з народнымі ўмельцамі, носьбітамі фальклору, майстрамі, запісваюцца ўспаміны, сакрэты майстэрства.

Важнай задачай педагогаў дадатковай адукацыі падчас працы над тэмай з’яўляецца не толькі навучыць бачыць і разумець, але і аналізаваць веды аб этнічных культурах, знаходзіць і прызнаваць у іх агульнае і адрознае.

**Змест дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах па рэалізацыі скразной тэмы**

| | |
|---|---|
| Аб’яднанні дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва | ❖ Вывучэнне і стварэнне мастацка-дэкаратыўнага афармлення, малюнкаў, макетаў разнастайных канструкцый (сцэнічныя пляцоўкі, гандлёвыя пабудовы, статычныя і дынамічныя канструктыўныя элементы). Мастацка-дэкаратыўныя работы павінны ў яскравай, вобразна-сімвалічнай форме адлюстроўваць ідэю тэмы, несці ў сабе пазнавальную і інфарматыўную накіраванасць. |
| Аб’яднанні музычнага і харэаграфічнага напрамка | ❖ Вывучэнне розных крыніц і музычна-харэаграфічнага матэрыялу па тэме. Стварэнне музычнага вобраза тэмы. Раскрыцце сэнсу ідэйнай накіраванасці тэмы музычна-харэаграфічнымі сродкамі. |
| Аб’яднанні тэатральнага напрамку | ❖ Збор матэрыялу. Вывучэнне фальклорна-этнаграфічных і мастацкіх матэрыялаў па тэме (вусна-паэтычных, музычных, харэаграфічных: прыказак, казак, легенд, паданняў, песень, танцаў, карагодаў, лічылак). Апрацоўка і сістэматызацыя матэрыялаў. Падрыхтоўка паведамленняў, прэзентацый, вусных выступленняў, афармленне газеты і інш. |

Абавязковай умовай дадзенага этапу з’яўляецца практычнае ўвасабленне тэарэтычнага матэрыялу: малюнкі, сувеніры, дэкарацыі, вершы, песні, танцы і г.д. Вядзецца падрыхтоўка да правядзення выніковага мерапрыемства:

састаўленне сцэнарыя, парыхтоўка дэкарацый, дыпломаў і прызоў, правядзенне рэкламы, запрашэнне гасцей. Вынікам дадзенага этапу з’яўляюцца творчыя работы навучэнцаў аб’яднанняў па інтарэсах, практычныя адлюстраванні скразной тэмы.

На ***заключным этапе*** праводзіцца выніковае мерапрыемства, на якім кожнае аб’яднанне па інтарэсах дэманструе вынікі праведзенай работы. Спалучэнне форм (выстава + канцэртная праграма, творчая сустрэча + майстар-клас і г.д.) дазваляе больш поўна прадставіць вывучаны матэрыял па скразной тэме, а парытэтнае ўзаемадзеянне забяспечвае шматгранны ўзаемаабмен ведамі.

**Дыяпазон выніковых мерапрыемстваў**

| ***Інфармацыйна-асветніцкія*** | ***Гульнёвыя формы*** | ***Паказальныя формы*** |
|---|---|---|
| Гасцёўня<br>творчая сустрэча<br>салон<br>прэзентацыя<br>вусны часопіс<br>віртуальная экскурсія | Ролевая гульня<br>квест<br>гульнёвая праграма<br>аўкцыён<br>гульня-падарожжа<br>гульневы карагод | Агляд-конкурс<br>выстава<br>свята<br>фестываль, ярмарка<br>канцэрт<br>майстар-клас |
| Адукацыйная (творчая, гульневая, інтэрактыўная, інфармацыйная) пляцоўка | | |

У Пастаўскім раённым цэнтры дзяцей і моладзі штогод для вывучэння выбіраецца адна альбо дзве скразныя тэмы дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага, музычна-харэаграфічнага і фальклорнага напрамкаў.


Калекцыя лялек "Феі года"


Танец "Завея"

Задачамі вывучэння скразной тэмы ***”Казачныя персанажы і вобразы беларускай міфалогіі, якія ўвасабляюць поры года“*** было не толькі пазнаёміць з персанажамі і вобразамі беларускай міфалогіі, але і распрацаваць аўтарскае бачанне персанажаў. У працэсе вывучэння тэмы навучэнцы аб’яднання па інтарэсах ”Рэлакс“ і студыі выяўленчага мастацтва ”Сяміцвецік“ падрыхтавалі прэзентацыю ”Поры года ў тварах“, навучэнцы аб’яднання па інтарэсах ”Юныя дызайнеры“ стварылі калекцыю лялек. Навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах музычна-харэаграфічнага напрамку знайшлі і развучылі песні па тэме, падрыхтавалі харэаграфічныя кампазіцыі.

Кульмінацыяй вывучэння скразной тэмы стала свята, на якім навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах прадэманстравалі творчыя работы з адлюстраваннем свайго прадстаўлення персанажаў і вобразаў па тэме, канцэртную і гульнявую праграмы. На свята запрашаліся навучэнцы ўсіх аб’яднанняў па інтарэсах Цэнтра, педагогі, бацькі.



У выніку вывучэння скразной тэмы ***”Чароўныя саламоны***



***Пастаўшчыны“*** навучэнцы падрыхтавалі творчы экскурс ў гісторыю ўзнікнення саламяных павукоў-абярэгаў, якіх на Пастаўшчыне называлі “саламоны”, пазнаёміліся з асаблівасцямі вырабу такіх павукоў, правялі творчую сустэчу з кіраўнікам гуртка па саломапляценнні Пастаўскага Дома

Калекцыя саламонаў "Поры года"



рамёстваў Т.М. Петух. Навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах дэкаратыўна-прыкладнога напрамку стварылі павукоў, выкарыстоўваючы не толькі саломку, але і іншыя матэрыялы (ніткі, папяровую лазу, паперу). Навучэнцы аб’яднання па інтарэсах ”Выяўленчае мастацтва“ і студыі выяўленчага мастацтва ”Сяміцвецік“ адлюстравалі ў сваіх работах сялянскія хаты, упрыгожаныя павукамі, студыі эстраднай песні ”Задорынка“ падрыхтавалі песні ”Павучок“, ”Павучок и Расінка“, студыі сучаснай харэаграфіі і тэатра танца ”Непаседы“ – харэаграфічную кампазіцыю ”Бабулін сакрэт“ і танец ”Павучкі“. Выніковае мерапрыемства было праведзена ў форме выставы-канцэрта. Усебаковая дэманстрацыя тэмы спрыяла асэнсаванню цеснай сувязі этнакультурнага мінулага і сучаснасці.

Павук. Саламон

Укараненне скразной тэмы ***”Сімвалы народнай харэаграфіі“*** было пабудавана па прынцыпу ад цэлага да частак з наступным ўз’яднаннем цэлага з частак. Навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах пазнаёміліся з некаторымі сімваламі народнай харэаграфіі (карагод, хваля, спіраль, кружэнне, адарацыя) і іх сімвалічным сэнсам. Прэзентацыя-скарбонка ”Сімвалы народнай харэаграфіі“, танцы з выкарыстаннем дадзеных сімвалаў, карагодныя песні, работы навучэнцаў аб’яднанняў па інтарэсах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога напрамку ”Танцавальны настрой“ і ”Танцавальная пара“ сталі творчымі ўвасабленнямі вывучанай тэмы.



Купальскі карагод

Вывучэнне скразных тэм фальклорнай тэматыкі ў Цэнтры традыцыйна прымеркавана да свят каляндарна-абрадавага цыклу (”Традыцыі святкавання Вялікдня на Беларусі“, ”Як святкуюць Каляды“, ”На Купалу ночка мала“ і г.д.). Вынікам вывучэння скразной тэмы з’яўляецца фальклорнае свята.

**Прыклад зместу дзейнасці па рэалізацыі скразной тэмы**
**”Як святкуюць Каляды“**

*Мэта:* вывучэнне гісторыі і традыцый абрада калядавання; даследаванне асаблівасцей калядавання і шчадравання на тэрыторыі Пастаўскага раёна.

*Задачы:* даследаваць і апісаць гісторыю і традыцыі калядавання і шчадравання ў Беларусі і іншых краінах, вызначыць асаблівасці абрадаў на Пастаўшчыне;

садзейнічаць далучэнню дзяцей і моладзі да этнакультурных каштоўнасцей, вывучэнню традыцый сваёй Радзімы;

спрыяць папулярызацыі калядных абрадаў праз дэманстрацыю вынікаў даследавання і абраду шчадравання;

стварыць умовы для арганізацыі змястоўнага адпачынку і карыснай занятасці навучэнцаў, творчай атмасферы для работы з адоранымі дзецьмі.

*Механізм укаранення этнакультурнага матэрыялу па тэме ўключае:*

- ❖ збор і вывучэнне інфармацыйнага матэрыялу аб традыцыях калядна-абрадавай культуры Беларусі, асаблівасцях святкавання Каляд на Пастаўшчыне;
- ❖ стварэнне творчых работ па тэме, калядных атрыбутаў, касцюмаў персанажаў абрада калядавання (шчадравання);
- ❖ развучванне калядных песен, стварэнне харэаграфічных кампазіцый;
- ❖ прэзентацыю творчых работ, правядзенне выставы і конкурсу малюнкаў, мастацкую рэканструкцыю абрада шчадравання.

**Практычная рэалізацыя скразной тэмы ў аб’яднаннях па інтарэсах**

| | |
|---|---|
| Аб’яднанне па інтарэсах ”Рэлакс“ | Творчая майстэрня ”Персаніфікацыя калядных герояў“. Паданне аб Езусе, вершы пра Каляды. Тэатралізаваная пастаноўка. Падрыхтоўка сцэнарыя фальклорнага свята. Падрыхтоўка і правядзенне квест-гульні ”Стравы калядных святаў“. |
| Аб’яднанні па інтарэсах дэкаратыўна-прыкладной творчасці | Творчая майстэрня ”Касцюмы і атрыбутыка калядоўшчыкаў“. Работы дэкаратыўна-прыкладной творчасці і выяўленчага мастацтва ”Калядныя матывы“, выраб Каляднай зоркі, масак і касцюмаў для калядавання. |
| Студыя эстраднай песні ”Задорынка“ | Развучванне песень пра Каляды |
| Фальклорны клуб «Лянок» | Развучванне калядак, музычна-рытмічных кампазіцый, народных гульняў, народных танцаў. Вывучэнне рэгіянальнага музычнага матэрыялу, характэрнага для калядных святаў Пастаўшчыны. |
| Студыя сучаснай харэаграфіі ”Sky-dance“, тэатр танца ”Непаседы“ | Развучванне танцаў з выкарыстаннем калядных сімвалаў, на калядную тэматыку |
| Аб’яднанне па інтарэсах “Выяўленчае мастацтва”, студыя выяўленчага мастацтва ”Сяміцвецік“ | Выстава малюнкаў ”Ішла Каляда-Калядзіца“ |
| Медыястудыя «PROнас» | Відэаздымкі мерапрыемстваў, сустрэч з работнікамі культуры, старэйшымі жыхарамі раёна. Стварэнне відэарэпартажа па тэме і прапаганда дзейнасці Цэнтра па рэалізацыі тэмы |

| | |
|---|---|
| | на раённым тэлебачанні, у сацыял… сайце Цэнтра. |

Выніковым мерапрыемствам стала фальклорнае свята ”Пастаўская шчадровіца“, на якое былі запрошаны навучэнцы ўсіх аб’яднанняў па інтарэсах Цэнтра, педагогі, бацькі, прадстаўнікі грамадскасці. Творчыя работы, створаныя падчас вывучэння скразной тэмы ”Як святкуюць Каляды“, былі прадстаўлены на конкурсах ”Калядная зорка“, ”Нашчадкі традыцый“, ”Здравствуй, мир“, на раённых мерапрыемствах.



Танец "Каляды". Рэспубліканскі конкурс "Здравствуй, мир!"

Свята “Пастаўская шчадровіца“

Кожны напрамак мастацкага профілю дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі прадстаўляе шырокія магчымасці для выкарыстання элементаў этнічнай культуры ў выхаванні навучэнцаў. Вывучэнне этнакультуры праз увядзенне скразных тэм дазваляе больш поўна раскрываць асаблівасці культуры, гісторыі, традыцый, побыту, захоўваць і развіваць духоўныя і культурныя каштоўнасці, укараняць актыўныя формы зносін вучняў паміж сабой і дарослымі, развіваць іх творчы патэнцыял. Далучэнне да скарбаў народнай культуры садзейнічае грамадзянскаму станаўленню асобы, назапашванню сацыяльнага вопыту, фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці дзяцей і моладзі, выхаванню патрыятычных і маральна-духоўных якасцей ў падрастаючага пакалення.